Паседжаньне рэспубліканскай арганізацыі Таварыства Беларускай Мовы па вылучэньні кандыдата ў дэпутаты БССР адбывалася ў вялікай аўдыторыі Тэхналягічнага інстытуту. Народу сабралася шмат, бо адным з вылучэнцаў быў Зянон Пазьняк. Каб яму перашкодзіць быць абраным кандыдатам, сабралі "лепшыя сілы" КПСС. Яны вылучылі ня толькі сваіх артадоксаў, але пастараліся сутыкнуць баларусаў ілбамі і прапанавалі ў якасьці альтэрнатывы Пазьняку вельмі прыстойнага чалавека, рэктара аднаго ВНУ. Памятаю, як шчываравў камуніст П. Краўчанка, нейкі камуніст Суша. У іх усё было адпрацавана гадамі, расьпісана, як па нотах. Але як ні стараліся камуністы, перашкодзіць Народнаму Фронту яны былі ня ў стане, і на гэтым сходзе перамог Занон Пазьняк, які быў абраны кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савету БССР ад ТБМ.

На гэты раз у кожным раёне былі нашыя вылучэнцы. У асноўным гэта была наша беларуская інтэлігенцыя, лепшыя людзі, якія стаялі на незалежніцкіх пазыцыях.

Пачалася перадвыбарчая кампанія. Групы падтрымкі фронтаўскіх кандыдатаў працавалі па выбарчых акругах ў кожным раёне. Я тады працавала ў сваім, Маскоўскім.

КОЙДАНАЎСКАЯ РАДА БНФ

У Маскоўскім раёне Менска Народны Фронт (Койданаўская рада) быў сканцэнтраваны на Паўднёвым Захадзе і кіраваў Радай Сяргей Міхноў. На тыя часы ён быў актыўным фронтаўцам, умеў арганізаваць людзей. Мы моцна сябравалі — Сяргей Міхноў, Сяргей Антончык і я. Пазьней такім сябрам стаў і Валянцін Голубеў.

У нашай Радзе сабралася шмат людзей, якія ня толькі "ў душы" жадалі пераменаў, але былі вельмі актыўнымі. Самае моцнае пачуцьцё таго часу для мяне зьяўляецца пачуцьцё пэўнай і вернай сяброўскай надзейнасьці. Нашыя думкі, дзеяньні і лад жыцьця я часам параўноўваю зь бегам, бо нашую агульную справу Адраджэньня Беларусі мы ўсе разам рабілі з энэргіяй, я б сказала "бягом".

На ўсё хапала сілаў і жаданьня зрабіць як найлепей і як найхутчэй. Мы зьбіраліся пасьля працы і абмяркоўвалі палітычную сітуацыю, свае дзеяньні па выбарчай кампаніі. Спачатку мы займаліся выбарчымі сходамі ў Вярхоўны Савет.

Найбольш прымальным для нас (хоць і надзвычай цяжкім) стаў шлях вылучэньня па месцу жыхарства ад выбаршчыкаў. (Можна было вылучацца яшчэ і ад працоўнага калектыву, але антыкамуністу гэты шлях быў зачынены: ні начальства, ні камуністычныя прафсаюзы не дапусьцілі б гэтага пад уціскам няўсыпнага вока партыйнага камітэту (паркаму), якія існавалі ў любым рабочым калектыве.)

Гэты шлях быў цяжкім, бо каб вылучыць у дэпутаты нашага прадстаўніка, неабходна было сабраць на кожны сход па вылучэньні фронтаўскага кандыдата ня менш за 500 жыхароў з выбарчай акругі. Мы ўпарта хадзілі па кватэрах і запрашалі на сход выбаршчыкаў. Хадзілі па дамах, стукаліся ў кожную кватэру, тлумачылі і запрашалі на сход. Бывала ўсяляк. Часамі, калі мы агітавалі па кватэрах, які-небудзь камуніст-артадокс выклікаў міліцыю, каб нас схапілі.

Але мы былі разам, мы былі як сям'я. Пра нейкія няўзгодненыя дзеяньні, нечую "самадзейнасьць", нязгоду з агульнапрынятым рашэньнем — не магло быць і гаворкі. Мы разумелі: трэба быць "у кулаку", пільна трымаць вуха, бо ворагаў і ахвочых загарнуць нашую Беларусь занадта шмат, каб ня быць пільнымі. Таму, нягледзячы на велізарную камуністычную машыну, вельмі часта мы перамагалі, хоць барацьбітоў, якія нічога не баяліся (ні камуністычнай улады, ні хлусьні, ні паклёпу), было ня так і шмат. А калі пазьней фронтаўская Апазыцыя ў Вярхоўным Савеце пачала перамагаць абсалютную камуністычную большасьць "малымі сіламі" і потым адновіла незалежнасьць Беларускай дзяржавы, яе нацыянальныя сымвалы, спыніла дзейнасьць КПСС рукамі самой жа КПСС і г. д., тады стаў відавочным ўсім Боскі закон: перамога даецца тым, хто змагаецца, хто аб'яднаны, дзейнічае ўзгоднена, як адзін кулак. (У наступнай выбарчай кампаніі ў 1995 годзе перамогі не адбылося, на мой погляд, яшчэ і таму, што для часткі фронтаўцаў выбары сталі "сваімі", асабістымі. Неабходныя былі салідарная ўзаемадапамога і татальны кантроль за ходам выбарчай кампаніі, што не пад сілу нейкім адзінкам і магло быць дасягнута толькі ўсімі разам. Рэжым ужо тады скарыстаў супроць Фронту безаглядную фальсіфікацыю. Але гэтай паразе паспрыялі і тыя, што перасталі дзейнічаць калектыўна — В. Івашкевіч, У. Анцулевіч, В. Трыгубовіч і іншыя раскольнікі, якія (каб стаць дэпутатамі) дзейнічалі згодна сваіх асабістых інтарэсаў, маючы свой "уласны выбарчы бюджэт" і ўласную выбарчую кампанію. У выніку — рэжыму ўдалося беспакарана сфальсіфікаваць выбары, і дэпутатам ад Фронту ня стаў ніхто.)

Нягледзячы на цяжкасьці, неабходны кворум на сходы выбаршчыкаў мы зьбіралі. Але абавязкова прыязджалі і прадстаўнікі з райвыканкаму, партыйныя "работнікі" сачыць за намі. Яны ўсяляк стараліся зацягнуць час пустымі пытаньнямі-дыскусіямі, каб людзі ня вытрымалі доўгага сядзеньня ў залі ў будні дзень. Калі намэнклятуры ўдавалася вельмі зацягнуць час, заля паступова пусьцела, не дачакаўшыся галасаваньня. У людзей, як заўсёды, было шмат справаў, асабліва ў жанчын. Дома чакалі дзеці, сям'я, назаўтра рана на працу, а тут сход зацягваецца на 3—5 гадзінаў... І тады ўсе нашыя намаганьні, каб сабраць людзей, аказваліся дарэмнымі: людзі не вытрымлівалі і йшлі дадому. Мы прасілі іх вярнуцца праз 1—2 гадзіны на галасаваньне. Было ўсяляк. Часам, назаўтра зноў пачыналі з абходу дамоў і з просьбай яшчэ раз сабрацца на сход...

Вынікі галасаваньня такога сходу пільна адсочваліся. У асноўным гэта тычылася колькасьці галасаваўшых. У астатнім (нягледзячы на стараньне намэнклятуры і ейныя правакацыі) мы перамагалі. Але нават калі сход прызнаваўся "не адбыўшымся", мы не гублялі прысутнасьці духу: зноў і зноў зьбіралі людзей на сходы. Так здарылася, калі мы зьбіралі сход па вылучэньні кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета ад Фронту Сяргея Міхнова, вылучыць кандыдатуру якога ўдалося толькі на другі раз.

Выступаючы на сходзе выбаршчыкаў па вылучэньню кандыдата ў дэпутаты, Сяргей моцна хваляваўся. Хваляваліся і мы, яго сябры. Але на Паўднёвым Захадзе Менска (дзе вылучаўся Сяргей) Фронт гучэў моцна, тут мы працавалі зладжана і шмат — і вынікі былі. І калі С. Міхноў стаў кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР, у яго абраньні дэпутатам ён (і ўсе мы) былі ўпэўненыя. Таму Сяргей на сваёй акрузе амаль не працаваў, а дапамагаў іншым фронтаўцам (у тым ліку і асабіста мне). А працаваць было трэба, і моцна.

(Працяг будзе.)

Народная Воля http://www.nv-online.info
24 СТУДЗЕНЯ 2008 г.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Таццяна БЕЛАНОГАЯ: «Двукроп'е — гэта толькі пачатак...»

У лютым адбудзецца прэзентацыя чацвёртага альбома беларускага барда Таццяны Беланогай "Двукроп'е".

Магчымасць зрабіць сапраўдны прафесійны альбом Таццяна Беланогая атрымала дзякуючы сваёй перамозе ў Міжнародным фестывалі бардаў "OPPA-2006" (Польшча).

"Двукроп'е" ўжо было прэзентавана ў Варшаве. Цяпер аўтар плануе пазнаёміць з ім сваіх беларускіх прыхільнікаў.

Таццяна Беланогая скончыла прыродазнаўчы факультэт БДПУ. Там на студэнцкім фестывалі песні і паэзіі "Зоркі над Мінскам" упершыню прагучалі песні, якія яна дагэтуль "*нікому ніколі не паказвала*". Гэты выступ Таццяна называе важнай падзеяй у сваім жыцці. Тое, што аўдыторыя прыняла і зразумела яе творчасць, надало 18-гадовай дзяўчыне сіл, каб рухацца далей. У 2004 годзе Таццяна Беланогая стала лаўрэатам фестывалю "Бардаўская восень", у 2005-м — атрымала перамогу ў музычным конкурсе "Зоркі Маладзечна".

Сёння, нягледзячы на свой малады ўзрост, беларускі бард мае ўжо 4 выдадзеныя альбомы.

"Двукроп'е" — альбом пра каханне, — гаворыць Таццяна. — *Кропка ў канцы сказа азначае скончаную думку, двукроп'е ж паказвае на тое, што будзе далей. Свой першы прафесійны альбом я лічу толькі пачаткам таго, што з Боскай дапамогай яшчэ спадзяюся сказаць у будучым"* .

Дар'я ГАРОШКА.

ПРЕМЬЕРА

В оперном — Бах, кофе и джаз

5 февраля в Национальном академическом большом театре оперы (Дом офицеров) — премьера спектакля "Бах... Кофе... Джаз..." на музыку "Кофейной кантаты" И.С.Баха в аранжировке белорусского композитора и исполнителя **Михаила Леончика**.

"Соавтор" Баха — музыкант Михаил Леончик рискнул стилизовать баховскую музыку в джазовой манере и дополнить ее собственным авторским материалом.

Напомним, что Михаил Леончик широко известен в Беларуси как талантливый и оригинальный цимбалист, лауреат многочисленных исполнительских конкурсов, стипендиат Специального фонда президента, интересный композитор, обучавшийся композиции и джазовой импровизации в Германии. Режиссер премьерного спектакля — Наталья Кузьменкова.

СЛЫШАЛИ?

Drum Ecstasy можно бесплатно скачать в интернете

Известная белорусская группа барабанщиков Drum Ecstasy следуют моде и оцифровывают свою музыку.

Все, что когда-либо записывалось музыкантами, будет выложено на их сайте www.drumecstasy.com в удобном для скачивания формате MP3. Кстати, скачивать музыку можно абсолютно бесплатно.

Еще одним сюрпризом для поклонников Drum Ecstasy станет совершенно новая композиция "Val". Именно она легла в основу саундтрека к российскому фильму "Самый лучший фильм".

"Правда, для фильма мы немного изменили композицию и записали "Val-2", — говорит лидер Drum Ecstasy Филипп Чмырь. — *Пока все права на нее у телеканала ТНТ, который и выпускает фильм".*

Drum Ecstasy по-прежнему остаются концертной группой. По словам музыкантов, их музыка в формате MP3 станет для них дополнительной рекламой.

КРУПНЫЙ ПЛАН

Анна ШАРКУНОВА:

«Я никогда не была гадким утенком...»

В последнее время без певицы Анны Шаркуновой не обходится почти ни одно культурное событие. Без сомнений, в свои 23 года Анна добилась уже очень многого

"Народной воле" Анна Шаркунова рассказала, как работала официанткой в ресторане и был ли у нее роман с одним из заместителей министра внутренних дел.

— Анна, мы с вами познакомились на церемонии вручения премии МТВ-Минск. Тогда вас признали лучшей поп-исполнительницей и в качестве награды дали... рулон туалетной бумаги с "денежным" рисунком. Если не секрет, куда вы его пристроили? Использовали по назначению или повесили на стенку в рамочке?

— Нет, этот подарок лежит в багажнике машины. Мы разделили награду с Дмитрием Карпинчиком, с которым вместе исполняли песни на церемонии вручения. Так что у нас было два рулона туалетной бумаги: один по сто евро, а второй — по пятьсот. Себе я забрала подарок с купюрами большего номинала. Кстати, мне кроме рулона бумаги вручили еще и матрешку. Только вот организаторы перепутали и дали мне статуэтку за "лучший Boys-band" вместо "Песняров". Мы до сих пор так и не поменялись этими матрешками...

— Анна, а может, тогда оценивали не столько ваши вокальные данные, сколько отдельные части тела?

— Нет, я так не считаю. Кстати, во время вручения этого "подарка" организаторы намекнули, что у белорусских артистов по сравнению с российскими слишком маленькие гонорары. Вот и подарили мне рулон "денежной" бумаги.

— Значит, вы не обиделись за такой, так сказать, знак внимания?

— Туалетная бумага — это часть шоу, шутка. А хорошая это или плохая шутка — это уже второй вопрос. Я не только не обиделась, а от души рассмеялась.

— Продюсер МТВ-Минск Валик Гришко заявлял, что та певица, которая во время церемонии выйдет на сцену топлес, получит рекордное количество ротаций на МТВ. Почему вы этого не сделали?

— У меня хороший клип, думаю, его будут в любом случае крутить. Кстати, никто не согласился на это предложение ради ротации клипа. Видимо, нужно было пообещать что-то более заманчивое и привлекательное.

— Есть мнение, что звезду Анны Шаркуновой зажег продюсерский центр "Спамаш". Мол, до "Спамаша" у вас и эфиров почти не было, и концертов маловато. Однако вы ушли от худрука "Спамаша" Владимира Кондрусевича к продюсеру Владимиру Кубышкину. Почему?

— Не спорю, доля правды в этом есть. Но эта информация не совсем правильная. После проекта "Звездный дилижанс" на одной из светских вечеринок мы познакомились с Вовой Кубышкиным и решили работать вместе. И только потом со своими идеями, песнями пошли в продюсерский центр "Спамаш", который помог нам финансово и технически, предоставил студию, базу, где можно было заниматься. Именно Владимир Кубышкин знал, как из обычной девочки сделать артистку. С продюсерским центром, который сыграл свою роль в становлении меня как певицы, "не срослось" по многим причинам. Дело в том, что мы подготовили хорошие качественные песни, которые выстрелили. И это произошло в то время, когда мы сотрудничали со "Спамашем". Да, старт получили от продюсерского центра, но мое становление как певицы — это целиком и полностью заслуга Владимира Кубышкина.

— А правда, что поначалу вам запрещали петь песни, которые вы исполняли в "Спамаше"?

— Если честно, то всегда пыталась устраниться от этих вопросов. Всем этим занимался мой продюсер. Да, я слышала об этом, но не углублялась в суть вопроса. Самое главное, что сейчас все нормально.

— Если не секрет, сколько денег было вложено в вашу раскрутку?

— Я не могу ответить на этот вопрос. Позвоните моему продюсеру, он все расскажет. Думаю, достаточно потратили. Хорошо, что съемки и эфир на телевидении бесплатные. Например, последний клип нам обошелся в 24 тысячи долларов. В феврале должна выйти моя пластинка, нужно записать еще две песни.

— Многие знают историю о вашем непростом распределении. По идее, после института вы должны были поехать в Пинск. Однако сейчас вы преподаете музыку в Педагогическом университете. Наверное, такое благополучное перераспределение здорово прибавило вам завистников...

— Среди моих близких, родных и знакомых недоброжелателей по отношению ко мне нет. В первый год своей профессиональной деятельности заходила на форум и читала о себе неприличные высказывания. Неприятно, когда о тебе плохо отзываются те, кто тебя абсолютно не знает. Знаю, что одновременно всем нравиться невозможно. Сейчас работаю руководителем вокальной студии в своем родном университете. Я не избежала распределения, просто ректор помог и перераспределил меня. Сейчас я работаю, получаю зарплату, выполняю свои обязанности. Живу в Минске, у меня с первого курса прописка и собственная однокомнатная квартира...

— Квартиру купили на гонорары от концертов?

— Нет, конечно. Мне помогли родители, они добавили определенную сумму. Мама у меня работает на заводе, а отец — моряк, пенсионер. Правда, теперь у него есть собственный небольшой бизнес. Мы вообще приехали в Пинск с Камчатки. Я сама с первого курса была официанткой в ресторане. Совмещала работу с певческой деятельностью и учебой.

— Значит, вам так и не удалось пожить в общежитии?

— Нет, на первом курсе я снимала комнату, жила в общежитии. Нас было шесть человек. Думаю, если бы я не узнала, что такое общага, то многое в своей жизни потеряла бы. Особенно мне запомнилось, как мы все вместе ели продукты, привезенные из дома. Благодаря общежитию я оценила все преимущества собственной квартиры.

— А какой у вас автомобиль?

— Черный Citroen. Я его сама купила. Эта машина мне больше всего подходит. Пока не собираюсь менять.

— В разгар скандала о вашем распределении ходило много слухов о вашем романе с одним из заместителей министра внутренних дел Беларуси...

— Да? *(Удивлению Анны не было границ.)* Да, я хотела устроиться в оркестр МВД, но не получилось. Может, из-за этого и поползли слухи, опять приписали мне очередной роман. Видите, сколько их у меня много? *(Смеется.)*

— Практически на всех тусовках вы появляетесь вместе со своим продюсером Владимиром Кубышкиным. С ним у вас тоже роман?

— Да, нас часто можно встретить вместе на тусовках, мы же друзья. Многие считают, что у певицы должен быть роман с продюсером. Я обычно не опровергаю и не подтверждаю такие слухи. Если кому-то хочется думать, что у нас роман, то пусть подумает. Ничего доказывать кому-то и никого переубеждать в чем-то не собираюсь. Это бесполезно.

— Вас называют одной из самых красивых белорусских певиц. Красота — хороший помощник на эстраде?

— Я всегда стараюсь выглядеть хорошо. Считаю, что в первую очередь красота должна быть в глазах. Внешность, конечно, помогает в жизни. Но я убеждена, что красота заключается не в цвете волос, ногтей... Она в чем-то другом.

— За последнее время вы изменились до неузнаваемости. Некоторые говорят: из гадкого утенка Шаркунова превратилась в настоящую гламурную барышню. С какими стилистами вы работаете?

— И кто так говорит? Я разве была гадким утенком?.. Никогда! Посмотрите на мои фотографии и сравните, какой я была раньше и какая сейчас. Абсолютно никакой разницы. А советы по поводу внешнего вида мне дает мой хороший знакомый Олег Новинский.

— И сколько времени у вас уходит на маникюры, массажи, солярии?

— Как когда. Ничего особенного я с собой не делаю. Я лучше уделю больше времени творчеству. Вот на это у меня уходит масса времени. А на своей внешности не зацикливаюсь.

— Ваши песни активно крутят на радиостанциях. Вы себя уже считаете известной белорусской певицей?

— В последнее время, наверное, да. Меня начинают узнавать, иногда даже в самые неподходящие моменты...

— Хочу уточнить: вы считаете себя такой же известной, как и Алла Пугачева?

— Вы издеваетесь надо мной? *(Анна рассмеялась.)* До этого уровня мне нужно еще работать и работать!

— Есть ли у вас кумиры в шоу-бизнесе, чьей карьере вы завидуете и хотели бы повторить?

— Есть исполнители, чьи песни вне времени. Это Мадонна, Майкл Джексон. На их творчество и нужно ориентироваться. Я реально оцениваю ситуацию, живу в Беларуси и понимаю, что повторить карьеру Мадонны просто невозможно.

— Как считаете, шоу-бизнес и дружба — совместимы?

— В шоу-бизнесе подруг у меня нет. Есть несколько друзей, которые меня понимают. Это Дима Карпинчик, с которым общаемся еще с проекта "Звездный дилижанс". Вместе с ним мы сила, помогаем друг другу. Ведь достаточно сложно и тяжело выживать даже в нашем мелком белорусском шоу-бизнесе. И еще есть несколько человек, с которыми могу всегда посоветоваться. Таких людей немного, но, слава Богу, они есть. Это Максим Алейников и Владимир Кубышкин.

— На шоу "Две звезды" ваш дуэт "завалил" Алексей Хлестов. Он поставил вам самый низкий балл, и вы вылетели из проекта. Этот случай не испортил ваших взаимоотношений?

— Этот инцидент, по-моему, давно исчерпал себя. Лешу я уважаю, у нас с ним нормальные отношения. Это единственный белорусский исполнитель, песни которого я постоянно пою и знаю наизусть. Так часто слушала его альбом, что диск пришлось выбросить — перестал читаться.

— Расскажите, с какими сложностями столкнулись, придя в белорусский шоу-бизнес?

— Когда пришла в шоу-бизнес, то была, наверное, тридцать третьей блондинкой, которая должна была всех распихать и показать, что на что-то способна. Многие думают, что это было сделать легко, но они ошибаются. Конечно, не всем понравилось, что появилась еще одна конкурентка. А сложности... Самым сложным для меня было — занять свою нишу.

— Как вы относитесь к тому, что белорусскую эстраду многие до сих пор называют местечковой?

— В наших силах все изменить. Может, это и так. Часто артисты уезжают в ту же Россию, и только потом у нас вспоминают о том, какие они хорошие. Но думаю, что и у нас в стране у каждого исполнителя есть шанс добиться успехов, стать популярным и известным. Может, у нас в стране нельзя зарабатывать миллионы, но и тратить их здесь особо некуда.

— Вспомните, как заработали свой первый рубль.

— Не знаю, можно ли говорить об этом... Еще в Пинске, будучи детьми, мы воровали на полях кукурузу, а потом ее продавали. Могли сдавать бутылки... Чего только не было! А первая серьезная работа — пионервожатая в лагере, потом ресторанная работа, библиотекарь...

— Беларусь на конкурсе "Евровидение" скорее всего будет представлять Руслан Алехно. Как вы к этому относитесь?

— По поводу того, кто поедет на сам конкурс, пока еще ничего не известно. Лично я болею за Гюнешь. Она, на мой взгляд, самая лучшая и харизматичная. С Алехно я просто не знакома и ничего о нем не знаю. Поэтому не могу судить.

— Звезда телесериала "Татьянин день" Татьяна Рудова в одном из интервью сказала, что ради съемок у Михалкова готова побриться налысо, хотя сейчас у нее длинные и очень красивые волосы. На что готова Анна Шаркунова, чтобы получить эфир на ТВ?

— Думаю, если бы была интересная роль, то я бы тоже так смогла... Тем более сейчас можно волосы нарастить. Мне кажется, что это не жертва.

— Анна, а вы политикой интересуетесь? Что думаете, например, о той же отмене льгот, проблемах, с которыми сейчас столкнулись предприниматели?

— Скажу честно, о политических вопросах думаю не очень часто. Что сейчас творится с индивидуальными предпринимателями, знаю, потому что это коснулось моих близких. Единственный телеканал, который я смотрю, это "Евроньюс", больше ничего не нравится, да и нет времени...

Дмитрий БОБРОВСКИЙ.

ЛИЧНОЕ ДЕЛО

Дата рождения: 14 октября 1984 года.
Хобби: фитнес.
Любимая страна: Италия.
Семейное положение: не замужем.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Алена Аладка — топ-мадэль свету

Беларуская мадэль Алена Аладка (на здымку злева) стала першай віцэ-міс прэстыжнага Міжнароднага конкурсу «Топ-мадэль свету»

Фінал конкурсу адбыўся ў Хургадзе (Егіпет).

За тытул "Топ-мадэль свету" змагаліся дзяўчаты больш як з 40 краін. Па выніках дэфіле ў вячэрніх сукенках і купальніках журы назвала пераможцай немку Алясандру Алорэс. Другой віцэ-міс стала ўдзельніца з Егіпта.

"Мы не сумняваліся, што ў Лены добрыя шанцы на прызавыя месцы на гэтым конкурсе, — зазначыла ў інтэрв'ю БелаПАН кіраўнік Нацыянальнай школы прыгажосці Вольга Сярожнікава. — *Як мадэль яна вельмі запатрабаваная, пастаянна ездзіць у Маскву на паказы і здымкі. А яе ўдзел у конкурсе "Топ-мадэль свету" мы не афішавалі, каб зрабіць сюрпрыз. І, як бачыце, ён удаўся!"*

АСАБІСТАЯ СПРАВА

Алена Аладка вучыцца на пятым курсе гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Ёй 22 гады.

Алена пастаянна ўдзельнічае ў "Тыдні моды" ў Маскве, рэкламуе вядомыя брэнды. Прадстаўляла Беларусь на Міжнародным конкурсе "Міс свету — 2007".

Параметры беларускай мадэлі: 86—60—89, рост — 178 см.

ФОТАФАКТ

Факсавы рэкорд

За ўсе гады існавання “Народнай волі” такога яшчэ не было — факс амаль у пяць метраў даўжынёй прыйшоў у рэдакцыю на мінулых выхадных, калі нікога з супрацоўнікаў не было, а апарат стаяў на аўтамаце.

Гэтыя метры — перапіска кінарэжысёра Руслана Зголіча з рознага ўзроўню чыноўнікамі, у першую чаргу — скаргі на кіраўніка "Беларусьфільма" Уладзіміра Замяталіна. З лістоў вынікае, што не такая простая сітуацыя ў беларускім кінематографе, як пра тое гаворыцца на афіцыйных прэс-канферэнцыях. У любым выпадку наш маленькі "факсавы рэкорд" сведчыць пра тое, што сітуацыя нездаровая, бо заўсёды ёсць цывілізаваныя метады вырашэння спрэчных пытанняў.



ЧУЛІ?

Сазановіч развітваецца

34-гадовая беларуская лёгкаатлетка Наталля Сазановіч аб'явіла аб завяршэнні спартыўнай кар'еры.

Як паведаміла прэс-сакратар Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Анастасія Марыніна, урачыстыя праводзіны сярэбранага і бронзавага прызёра Алімпійскіх гульняў у сямібор'і пройдуць 24 студзеня ў манежы Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па лёгкай атлетыцы ў Мінску ў межах чэмпіянату Беларусі па лёгкаатлетычным многаборстве.

Наталля Сазановіч — заслужаны майстар спорту, сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў-1996 у Атланце, бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў-2000 у Сіднеі, пераможца і прызёр чэмпіянатаў свету, Еўропы, пераможца Кубка Еўропы (суперліга). Лёгкай атлетыкай пачала займацца ў 1984 годзе. Прадстаўляла БФСТ "Дынама". Алімпіяда 2004 года ў Грэцыі была для спартсменкі няўдалай: пасля двух відаў праграмы яна знялася са спаборніцтваў з-за разрыву мышцы нагі.

Дзмітрый УЛАСАЎ.

В рейд идут эвакуаторы

До конца января на центральных улицах Минска по будним дням будут курсировать эвакуаторы ГАИ.

Как сообщила начальник отделения агитации и пропаганды ГАИ ГУВД Мингорисполкома Жанна Тройно, инспекторы дорожно-патрульной службы будут буксировать на охраняемые стоянки машины, припаркованные с нарушением правил. Под контролем ГАИ будут находиться прежде всего улицы Ленина, Кирова, Комсомольская, Володарского, Энгельса, Маркса, Интернациональная, Мельникайте, Романовская Слобода, Немига. Автовладельцев, нарушающих правила остановки и стоянки транспортных средств, ожидает максимальный штраф в 5 базовых величин и еще много нервотрепки. Так что будьте внимательны!

ЗДАРЭННЕ

Выбух пачуццяў

Не з кветкамі, як раней, а з 5-літровай пластыкавай каністрай бензіну прыйшоў 38-гадовы спецыяліст прадпрыемства "Віцебскгаз" да гераіні свайго службовага рамана. Мэтай візіту была помста за адмову ад рамантычных спатканняў і, як меркаваў сучасны Атэла, здраду.

Акт помсты меў адбыцца ў тым кабінеце канторы прадпрыемства, дзе працавала "здрадніца" разам з трыма іншымі жанчынамі.

Прыйшоўшы ў офіснае памяшканне, мсціўца папрасіў саслужывіц сваёй каханай выйсці, пакінуўшы іх сам-насам. Тыя выканалі просьбу, але, пачуўшы з калідора крыкі сяброўкі аб паратунку, кінуліся на дапамогу.

Якраз у гэты момант Дзмітрый Р. падпаліў бензін...

Прагучаў магутны выбух, які разбурыў падвясную столь і мэблю, выбіў шыбы і пашкодзіў камп'ютэрную тэхніку.

Ад апёкаў ды іншых траўм пацярпелі ўсе прысутныя. Але найбольш — сам падрыўнік. З апёкамі 90% цела яго адвезлі ў абласную клінічную бальніцу, дзе ён праз лічаныя дні памёр у жудасных пакутах.

Ненашмат меншыя апёкі атрымала ягоная нядаўняя каханка. За яе жыццё змагаюцца ўрачы сталічнага апёкавага цэнтра. А вось адна з жанчын-саслужывіц таксама не выжыла.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

АЛІМП

Андрэй РЫБАКОЎ:

«Шанц ёсць заўжды»

Беларускі цяжкаатлет Андрэй Рыбакоў прымусіў гаварыць пра сябе пасля паспяховага выступлення на Алімпіядзе ў Афінах. У Грэцыю спартсмен адпраўляўся як "темная лошадка", а прывёз адтуль сярэбраную ўзнагароду.

Да будучай Алімпіяды ў Пекіне засталося зусім нічога — зараз спартсмены праводзяць заключны этап падрыхтоўкі, і на Андрэя Рыбакова ўскладзены спадзяванні трэнераў і балельшчыкаў.

Гэтыя спадзяванні маюць пад сабой падставы — на мінулагоднім першынстве планеты Рыбакоў заваяваў ажно тры залатыя медалі, што дазволіла яму ўвайсці ў дзесятку лепшых спартсменаў краіны...

...Відавочна, што да ўрачыстасцяў Андрэй Рыбакоў яшчэ не прызвычаіўся. Вось і на ўганараванні дзесяткі лепшых спартсменаў Беларусі-2007 ён прыкметна хваляваўся. Ад хвалявання Андрэй нават не ўтрымаў карціну, якую ў знак удзячнасці падарылі яму функцыянеры.

Напэўна, Андрэю куды прасцей выходзіць на памост і весці змаганне са штангай. У жыцці ж ён сціплы і нешматслоўны хлопец. *"Зараз засяроджаны на падрыхтоўцы да Алімпіяды,* — адзначае спартсмен — *Да самай Алімпіяды будзем трэніравацца ў Стайках. Рыхтуемся, як заўжды, па два разы на дзень, нічога асаблівага ў трэніровачным працэсе няма. А вось пасля галоўнага старту чатырохгоддзя і паразмаўляць можна будзе".*

Цяжкай атлетыкай Андрэй Рыбакоў стаў займацца ў родным Магілёве. Было гэта ў 1995 годзе. Хлопца прыкмеціў трэнер Васіль Балахонаў, які набіраў групу для заняткаў цяжкай атлетыкай. *"У прынцыпе, я спорт з самага дзяцінства люблю,* — прызнаецца Андрэй. — *Прыйшоў у спортзал, і спадабалася мне цяжкасці ўздымаць. Хаця тады, у сярэдзіне 1990-х гадоў, я і меркаваць не мог, што здолею выбіцца ў лідэры. На той момант была адна задача — па вуліцы не бадзяцца, як многія мае равеснікі".*

Пазней Васіль Балахонаў перадаў Андрэя Рыбакова ў рукі свайго трэнера Аляксандра Ганчарова, які зараз працуе з нацыянальнай зборнай Беларусі па цяжкай атлетыцы. Вопытны трэнер адразу заўважыў, што з Рыбакова можа атрымацца добры спартсмен — дзякуй Богу фактура дазваляла.

Праўда, аднойчы ў Аляксандра Ганчарова ўзнікла пытанне, ці адбудзецца Рыбакоў як спартсмен. Адразу пасля пераходу да новага трэнера Андрэй не зусім сур'ёзна ставіўся да трэніровак. Рыбакоў знік з поля зроку Ганчарова прыкладна на тыдзень, а трэнеру сказаў, што паехаў да маці на дачу.

Пасля гэтага выпадку паміж трэнерам і спартсменам адбылася мужчынская размова. Рыбакову па сутнасці быў пастаўлены ультыматум: альбо сыходзіць з цяжкай атлетыкі, альбо застацца і выконваць усё тое, што трэба для нармальнага трэніровачнага працэсу. Рыбакоў выбраў спорт.

Спорт дысцыпліне любога. Андрэй Рыбакоў у гэтым сэнсе не стаў выключэннем. Спачатку ён паступіў у вучылішча алімпійскага рэзерву, затым стаў студэнтам Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя Куляшова. Праўда, на наведванне лекцый у маладога спартсмена з-за трэніровак і збораў не заўжды хапае часу. Нестае вольнага часу ў Андрэя Рыбакова і на хобі.

Журналісты, якія любяць пагуляць словамі, не ўпускаюць магчымасці пацікавіцца ў Андрэя, ці любіць той рыбалку: *"З вудай на беразе возера сядзець даводзілася, але я не скажу, што з'яўляюся фанатыкам рыбалкі. Роўна як і да страў з рыбы адношуся абсалютна спакойна. Увогуле, ем тое, што даюць..."*

Зараз, менш чым за 200 дзён да Алімпіяды, Андрэй Рыбакоў ні пра што, акрамя будучых гульняў, здаецца, і не думае. Спартсмены ўвогуле народ, які верыць у забабоны, таму ў сваіх прагнозах на будучае выступленне Андрэй даволі асцярожны. "Канечне, калекцыяніраваць медалі прыемна, — гаворыць Рыбакоў. — Хацелася б папоўніць калекцыю залатым медалём з Пекіна, але гэтага ж хочуць і мае сапернікі. Таму прыйдзецца паўпірацца".

Сваіх асноўных канкурэнтаў на будучай Алімпіядзе Андрэй Рыбакоў ведае: *"Галоўнымі сапернікамі, напэўна, будуць спартсмены з Расіі і Турцыі. Праўда, і я пастараюся тварам у бруд не ўдарыць".*

Наконт верагоднасці атрымаць алімпійскае золата Андрэй Рыбакоў толькі ўсміхаецца і пасля паўзы дадае: *"Паглядзім, шанц ёсць заўжды".*

Віталь ГАРБУЗАЎ.
Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.

СТОЛИЦА

Настя и Никита — самые любимые имена минчан

Демографическая ситуация в столице улучшается. Так, в минувшем году в Минске родились 20.610 малышей, это на 1754 больше, чем в 2006-м, и на 2891 — чем в 2005-м.

Об этом сообщили в управлении юстиции Мингорисполкома.

Причем в минувшем году чаще рождались мальчики — 1087, девочек же — 1015. Что касается имен, популярных у родителей новорожденных, то в лидерах прошлого года — Анастасия и Никита. В числе популярных также Мария, Дарья, Ксения, Максим, Артем, Иван.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

У любы дзень

Вы можаце зрабіць перадаплату за будучыя нумары "Народнай волі"

Паўтараем просьбу да тых, хто да гэтага часу не паспеў па-новаму зрабіць перадаплату: зрабіце гэта, калі ласка, у бліжэйшыя дні. Дзеля гэтага мы сёння ў чарговы раз друкуем неабходныя карткі. Вас чакаюць у любым філіяле "Беларусбанка", а таксама ў паштовых аддзяленнях.

Ёсць магчымасць зрабіць **перадаплату** не толькі за студзеньскія нумары, а і за лютаўскія, сакавіцкія — калі ласка! Можна аплаціць і ўсе нумары першай паловы 2008 года.

У чарговы раз нагадваем: мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: **328-63-93** ці **328-68-71**. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць перадаплату за любы тэрмін.

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па перадаплаце ранейшыя: на месяц — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з Новага года павысіўся, то выгадна зрабіць перадаплату за ўсё паўгоддзе альбо за пэўны перыяд: месяц, два, тры...

Банкаўскія рэквізіты “Народнай волі” такія:

УП “Народная воля”: р/р 3012006535014, ААТ “Пріорбанк”, ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за ноябрь, декабрь 2007 г.,				
январь, февраль, март, апрель, май,				
июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за ноябрь, декабрь 2007 г.,				
январь, февраль, март, апрель, май,				
июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов.

Абонентская карточка
на номера газеты «Народная воля»
за ноябрь, декабрь 2007 г., за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется печатными буквами и обязательно отправляется в редакцию с копией платежного документа

фамилия
имя отч.
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное подчеркнуть)
улица
пр-т
переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом корп. кв.
(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

SOS!

Рабчыкі і глушцы знікнуць. Можа, з'явяцца фламінга?

У Беларусі могуць поўнасцю знікнуць рабчыкі, глушцы, цецерукі і крыжадзюбы-яловікі. Аб гэтым БелаПАН паведаміў дырэктар грамадскай арганізацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны" Віктар Фянчук. Паводле яго слоў, у сувязі з пацяпленнем клімату прагноз на знікненне гэтых відаў у Беларусі робіць Кліматычны атлас птушак, якія гняздуюцца ў Еўропе, прадстаўлены Міжнароднай прыродаахоўнай арганізацыяй "Бердлайф Інтэрнешнл" 15 студзеня 2008 года.

Віктар Фянчук зазначыў, што цяпер рабчыкі і глушцы шырока распаўсюджаны на тэрыторыі краіны. Апрача таго, гэта паляўнічыя віды. Таму, паводле яго меркавання, знікненне такіх птушак не застанецца па-за ўвагай беларусаў, нават нягледзячы на тое, што яно расцягнецца прыблізна на сто гадоў. Спецыяліст расказаў, што ад змянення клімату пацерпяць таксама многія іншыя віды птушак. Так, далёка на поўнач ад Беларусі перасунецца мяжа распаўсюджання шэрага жураўля, чаромашніка, шэрагу вадаплаўных птушак, такіх як чорнаваллёвая гагара, цыранка, чубатая чэрнець. Знікнуць рэдкія віды вяртлявай чарацянкі і вялікага падворліка. "У цэлым умовы для існавання птушак пагоршацца, хаця для асобных відаў змяненне клімату можа быць спрыяльным", — сказаў В.Фянчук.

Так, на ўсёй тэрыторыі краіны чакаецца з'яўленне паўднёвых відаў чаплевых: малой белай, рудой і жоўтай чапляў, колпіцы, кваквы, а таксама драфы і некаторых іншых відаў птушак.

На думку спецыяліста, неабходна супрацьдзейнічаць пацяпленню і высушванню клімату ў Беларусі. Для гэтага павінны рабіцца захады па памяншэнні выкіду парніковых газаў і захаванні водных рэсурсаў краіны. У прыватнасці, кіраўнік АПБ лічыць, што важней за ўсё захоўваць існуючыя балоты і аднаўляць тыя з іх, што былі парушаны меліярацыяй.

Анастасія ЯНУШЭЎСКАЯ.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА “Типография Михайлова - С”, 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА “Типография Михайлова”, 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 22.01.2008 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №